## СУБОТА, 5 ВЕРАСНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**7.20** Існасць.
**7.50 Меладрама «Райскі куток».**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.40, 1.00 Серыял «Два бацькі і два сыны».**
**10.45** «50 рэцэптаў першага».
**11.25** Дача.
**12.10** Ток-шоу «Здароўе».
**12.50** «Terra incognita». Беларусь невядомая.
**13.25** Выйсце ёсць.
**14.00, 2.00 Серыял «Сямейныя меладрамы-5».**
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.30** Зроблена ў Беларусі.
**15.50 Меладрама «Прычал Любові і Надзеі». 1-я серыя.**
**17.40 Меладрама «Ці то ў садзе, ці то ў агародзе». 1-я і 2-я серыі.**
**21.00** Панарама.
**21.35 Меладрама «Жыццё рассудзіць». 1-я і 2-я серыі.**
**1.50** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.05** М/с «Клуб Вінкс. Школа чараўніц».
**7.35** Навуковае шоу прафесара Адкрывашкіна.
**8.05 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
**10.05** Азбука смаку.
**10.40** Анімацыя для ўсёй сям'і. «Вецер мацнее».
**12.50, 21.35** Тэлебарометр.
**12.55** Капейка ў капейку.
**13.35** «Бітва экстрасэнсаў. Трэцяя сусветная».
**15.50** Вось гэта дзіва!
**16.25, 0.15 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».**
**18.55** Футбол. Еўра-2016. Кваліфікацыя. Украіна — Беларусь.
**21.00** Цела чалавека.
**21.40** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**21.45 Камедыя «Паляўнічы на галовы».**

**23.45** Футбол. Еўра-2016. Кваліфікацыя. Агляд гульнявога дня.

### БЕЛАРУСЬ 3

**8.00, 13.10, 17.50, 0.30** «Калейдаскоп».
**8.10, 16.20 «Вяртанне Хаджы Насрэдзіна». Камедыя.**
**9.40** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**10.10 «Загад: агонь не адкрываць». Драма.**
**13.20** «Камертон». Юозас Будрайціс.
**13.50 «Плач пералётнай птушкі». Драма.**
**15.00** «Славянскі базар-2013. Было каханне».
**18.00 «Памылка рэзідэнта». Дэтэктыў. Часткі 1-я і 2-я.**



**20.20** Вандроўка з «Бяседай».
**20.45** «Калыханка».
**21.05 «Палкоўніку ніхто не піша...» Драма.**
**23.00** «Песні мінулага стагоддзя».
**23.50** «Подых струн». Музычная праграма. Госць: Алеся Мядзведзева.

### БЕЛАРУСЬ 5

**7.15, 7.45, 1.30** PRO спорт. Навіны.
**7.30** Спорт-мікс.
**8.05** Свет англійскай прэм'ер-лігі.
**8.30** Піт-стоп.
**9.00** Хакей. Ліга чэмпіёнаў. «Вітковіцэ» (Чэхія) — «Нёман» (Гродна, Беларусь).
**10.50, 14.05, 19.15** Веславанне акадэмічнае. Чэмпіянат свету. Фіналы.

**12.00** Змяшаныя адзінаборствы. ММА. М-1 Global.
**16.25** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Металург» (Жлобін) — «Дынама» U-20 (Бабруйск).
**18.40** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**22.40** Футбол. Кваліфікацыя да Еўра-2016. Украіна — Беларусь.
**0.35** Еўрапейскі покерны тур.

### АНТ

**7.00** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00, 16.00, 20.30** Навіны.
**9.05** М/с «Смяшарыкі. Новыя прыгоды».
**9.25** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.10** Да юбілею акцёра. «Валянцін Гафт. «Чужое жыццё іграю, як сваё».
**12.20 Серыял «Асабістае жыццё следчага Савельева».**
**16.15, 21.00** Навіны спорту.
**16.20** «Раманавы».
**18.20** «ДОстояние РЕспублики: Давід Тухманаў».
**21.05** Канцэрт «Мы разам. Брэсцкая вобласць».
**23.20** «Сёння ўвечары».
**0.50 Маст. фільм «Дом Хэмінгуэй».**

### СТБ

**6.20 Маст. фільм «Аперацыя «Хальцаугее».**
**7.50** «Анфас».
**8.05** «Тайны свету».
**9.00** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**10.00** «Іншая краіна». «Зямля доўгага белага воблака».
**10.40** «Далёкія сваякі».
**11.00** «Мінск і мінчане».
**11.40** Канцэрт дзіцячай творчасці «Ці то яшчэ будзе...».
**13.30, 16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**13.40, 0.20 Маст. фільм «Адноючы праз дваццаць гадоў».**
**15.10** «Вадзіць па-руску».
**15.50** «Вялікі горад».
**16.40** «Наша справа».
**16.55** Канцэрт Міхаіла Задорнава.

**17.35 Маст. фільм «Спецыяліст».**
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10 Маст. фільм «Галодныя гульні».**



**22.35** «Дакументальны праект»: «Бітва часоў».
**1.40** «Маска. Дзень і ноч».

### МІР

**6.00, 8.35, 5.20** М/ф.
**8.10** «Саюзнікі».
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Зроблена ў СССР».
**10.45 Маст. фільм «Пакроўскія вароты».**
**13.20 Маст. фільм «Чалавек, які смяецца».**
**15.15** «Культпрасвет».
**16.15 Серыял «Залаты капкан».**
**22.35 Маст. фільм «Амерыканец».**
**0.40 Маст. фільм «Чалавек з бульвара Капуцынаў».**
**2.30 Маст. фільм «Волга-Волга».**
**4.25** Дак. фільм «З нагоды. Якія ляцяць па хвалях».

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00, 16.45** «Ха». Маленькія камедыі.
**7.35 Маст. фільм «Не адпускай мяне».**
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.15** «Танкавы біятлон».
**12.15 Маст. фільм «Не магу сказаць «бывай».**
**14.15 Маст. фільм «Сюрпрыз для любімага».**
**16.05** «Маё жыццё зробленае ў Расіі».
**17.30** «Суботні вечар».

**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.40 Маст. фільм «Трэцяя спроба».**
**22.30 Маст. фільм «Тэорыя неверагоднасці».**

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.10, 8.20 Серыял «Дарожны патруль».**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00** Сёння.
**8.50** «Іх норавы».
**9.25** «Справа густу».
**10.25** «Галоўная дарога».
**11.00** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.20** «Я худзею!»
**14.15, 16.20 Серыял «Лютасць».**
**18.05** «Следства вялі».
**19.00** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**20.05** «Новыя рускія сенсацыі».
**21.05** «Ты не паверыш!»
**22.00** «50 адценняў. Бялова».
**23.00 Маст. фільм «Помста без права перадачы».**
**0.35** «Як на духу».

### 8 КАНАЛ

**9.00, 14.00, 19.05, 20.55, 23.20** «Надвор'е».
**9.05** М/ф.
**9.30 Серыял «Я чую голас твой».**
**10.35, 11.50, 15.55, 17.20** «Хатняя крама».
**10.50, 23.25** «Хобі TV».
**11.40** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**12.05 Прыгоды «Жалезная хватка».**
**14.05 Драма «Прыстанак Евы».**
**16.00** «Адшукваецца адпачынак.
**16.30 Серыял «Альф».**
**17.30 Серыял «Агент Картэр».**
**19.10 Камедыя «На здароўе».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00** «Фэшн is my прафэшн».
**21.10 Камедыя «Па-за полем зроку».**

### ВТБ

**6.00** «PLAY».
**7.30, 14.30** «Хатняя кухня».
**8.00** «Ералаш».
**9.00** Серыял «Вароніны».
**10.00, 1.00** «Турба міксер».
**12.00** Баявік «Васабі».
**14.00, 22.40** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**15.00, 5.00** Серыял «Свацці».
**17.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**17.30** «Уральскія пельмені».
**19.00** Серыял «Два бацькі і два сыны».
**20.30** Баявік «Куленепрабівальны».
**23.30** «Без вежы».
**0.30, 4.00** «Лаві момант».
**3.30** Скетч-шоу «Валера-ТБ».
**4.30** Скетч-шоу «6 кадраў».

### КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** «Звычайны канцэрт».
**10.35** «На галоўнай вуліцы з аркестрам». Маст. фільм.
**12.05** «Алег Барысаў». Дак. фільм.
**12.45, 15.15, 18.30** Навіны культуры. Спецвыпуск.
**13.00** Вялікая сям'я. Алеся Жалязняк.
**13.55** «Красная плошча. Чытай, Расія!». Дак. фільм.
**14.05** «Мой сярэбраны шар». «Ірына Пячэрнікава».
**15.25** «Лізавета». Маст. фільм.
**17.20** «На краі зямлі расійскай». Дак. фільм.
**18.40** Да 85-годдзя з дня нараджэння Андрэя Пятрова. «Геній кампрамісу». Дак. фільм.
**19.15** «Рамантыка рамансa». Андрэю Пятрову прысвячаецца...
**20.15** «Зялёны агеньчык». Маст. фільм.
**21.25** XXIV цырымонія ўзнагароджання лаўрэатаў тэатральнай прэміі «Хрустальная Турандот».
**22.40** Кіно на ўсе часы. «Лізавета. Залаты век». Маст. фільм.

**0.25** «Х'ю Лоры: Няхай гавораць».
**1.20** «Слондайк». «Слондайк 2». М/ф для дарослых.
**1.55** «Шукальнікі». «Жалезная маска Дома Раманавых».
**2.40** «Сусветныя скарбы культуры».

### НАСТАЛЬГІЯ

**6.00** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно... Тэлевізійныя мемуары». Клара Новікава.
**6.20, 8.00, 9.40, 11.00, 12.40, 15.40, 17.00, 18.45, 20.20, 23.30, 0.25, 2.20, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.
**7.00** Маст. фільм «Дзівак-чалавек».
**8.40** М/ф «Тайна краіны суніц».
**9.00, 15.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 4.00** «Народжаны ў СССР».
**12.00, 18.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1977. Паўтор ад 2009 года.
**13.00** Маст. фільм «Квартэт Гварнеры».
**14.45** М/ф «Пушок і сябрук».
**16.00** «Колба часу».
**19.55** Маст. фільм «У мора, дзе мы гулялі».
**20.40** М/ф «Болек і Лёлек — шукальнікі прыгод».
**21.00** «Быў час». 2009 год.
**22.00** Маст. фільм «Наш сумленны хлеб».
**0.00** Кароткаметражны фільм «Шчаслівы Кукушкін».
**1.00** Маст. фільм «Гамбрынус».
**2.40** М/ф «Спадарожніца каралевы».

### EUROSPORT

**4.00, 6.30, 8.30, 10.00, 12.45, 19.00, 22.15, 2.15** Тэніс. Турнір Вялікага шлема. US Open.
**6.00, 8.00, 9.30** Тэніс. Турнір Вялікага шлема. Сняданак на US Open.
**12.00, 16.00, 17.00** Веласпорт. Вуэльта.
**14.15** Веславанне. Чэмпіянат свету.

**16.45, 18.45** Веласпорт. Вуэльта Экстра.
**22.00, 2.00** Тэніс. Гейм, сэт і Матс.

### КАМЕДЫЯ

**6.00, 10.00, 3.05** Серыял «Маё вялікае армянскае вяселле».
**6.50** Камедыя «Укол парасонам».
**8.25** Камедыя «Віктар».
**10.55** Камедыя «Поспехаў, Чак».
**12.35** Камедыя «Іронія кахання».



**14.00, 20.00, 22.45, 0.50, 2.50, 5.40** Скетчком «Паміж намі».
**14.20** Камедыя «Два з палова жулікі».
**16.00** Камедыя «Муж двух жонак».
**17.35, 22.00** Серыял «Шчаслівыя ў разводзе».
**18.25** Камедыя «Крама цудаў».
**20.20** Камедыя «Шпіён па суседстве».
**23.10** Камедыя «Паўднёвыя моры».
**1.15** Камедыя «Шалёныя грошы».
**4.00** Камедыя «Я ніколі не буду тваёй».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**9.55, 5.15** «Нераскрытыя тайны».
**10.50** «Prokіно».
**11.00** «Хронікі маскоўскага побыту».
**11.50** «Гісторыі выратавання».
**12.25, 0.40** Серыял «Цудоўнае стагоддзе».
**16.15** М/ф «Планета 51».
**17.40, 4.00** Дак. фільм «Ірына Алеграва. Маё жыццё — сцэна».

**19.20** Маст. фільм «Неадэкватныя людзі».
**21.20** Маст. фільм «Барвовыя рэкі 2».
**23.10** Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».

### ТБ1000

**6.00, 4.00** Баявік «Быць Флінам».
**8.00** Драма «Паўночная краіна».
**10.05** Камедыя «Міс Кангеніяльнасць II: прыгожая і небяспечная».
**12.00** Камедыя «Горад і вёска».
**13.45** Драма «Магія слоў: Гісторыя Дж.К. Роўлінг».
**15.10** Меладрама «Сямейка Джонсаў».
**16.45** Камедыя «Даю год».
**18.20** Драма «Абяцанне».
**20.00, 2.00** Трылер «Дзіця чалавечае».
**21.45** Драма «Рамэа і Джульета».
**0.00** Камедыя «Каханне на кончыках пальцаў».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Драма «Франц+Паліна».
**8.50** Камедыя «Сябры сяброў».
**10.35** Меладрама «Дзённік мамы першакласніка».
**12.10** Трагікамедыя «Яно».
**14.30** Трагікамедыя «Адзінокая жанчына жадае пазнаёміцца».
**16.10** Драма «Шагал-Малевіч».
**18.20** Драма «Гагарын: Першы ў космасе».
**20.20** Драма «Смяцяр».
**21.55** Фантастыка «Форт Рос: У пошуках прыгод».
**23.40** Драма «Анёлы вайны».
**1.45** Драма «Танкер «Танга».
**3.45** Трагікамедыя «Пра жонку, мару і яшчэ адну...».
**5.00** Камедыя «М+Ж».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00, 8.10** Гульні розуму.
**7.15** Навуковыя недарэчнасці.

**7.40** Код небяспекі.
**8.40** Узлом сістэмы.
**9.20** Золата Юкана.
**10.10** Сканеры старажытнага свету.
**11.00** Навука будучыні.
**11.50** Космас: Прастора і час.
**12.40** Мегазаводы.
**13.30** Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.
**14.20** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**15.10** Дзікія жывёлы Поўначы.
**16.00** Панарама 360.
**16.50** Калі кракадзілы елі дыназаўраў.
**17.40** Тайвань: востраў рыбы.
**18.30** Смяротны бой дыназаўраў.
**19.20** Больш, чым тыраназаўр.
**20.10** Праект: Дыназаўр.
**21.00, 1.10, 4.30** Ізумруд за 400 мільёнаў долараў.
**21.50, 2.00, 5.15** Вайна за золата Калумбіі.
**22.40, 2.50** Разбагацей або памры на капальні.
**23.30, 3.40** Расследаванні авіякатастроф.
**0.20** Уварванне на Зямлю.

### DISCOVERY

**8.00, 17.10, 6.25** Вулічныя гонкі.
**8.50, 15.30, 3.00** Хуткія і гучныя.
**9.40, 16.20, 1.00, 7.13** Калекцыянеры аўто.
**10.30** Дарожныя каўбоі.
**11.20** Смяротны ўлоў.
**12.10** Ледзяное золата.
**13.00, 4.50** Іржавая імперыя.
**13.50, 0.00** Склады.
**14.40** Паляўнічыя на рэліквіі.
**18.00** Ванная «пад ключ».
**18.50** Неверагодныя басейны.
**19.40** Акварыумны бізнес.
**20.30** Адпетыя рыелтары.
**23.00** Сысці ад пагоні.
**2.00** Стаць мужчынам.
**4.00** Інжынерныя пралікі.
**5.38** Як гэта ўстроена?
**6.01** Як гэта зроблена?

---

## На экране

# ДВА ДНІ, АДНА НОЧ

**Прыйшоў час расказаць, што газета «Звязда» ладзіць у Доме прэсы (дзе і знаходзіцца) уласныя кінапаказы. Можна назваць гэта кінаклубам (у такім выпадку яго назва — «КІНО Д'АР»), а можна — выпадковымі сустрэчамі аматараў кіно. Што мы глядзім? Сапраўднае мастацкае кіно: як класіку, так і сучасныя аўтарскія фільмы. За плячыма ў нас абмеркаванне брытанскага «Двайніка» Рычарда Аёадзі, французскай «Апаланіды» Бертрана Банело, амерыканская «Вялікага дыктатара» Чарльза Чапліна, італьянскіх «Скрадальнікаў веласіпедаў» Віторыа дэ Сіка, канадскай «Мамачкі» Ксаўе Далана, фільма «Дзяўчына вяртаецца ноччу дадому адна» іранкі Аны Лілі Амірпур...**

Апошнім разам (паказ адбыўся 20 жніўня) мы вырашылі звярнуцца да сучаснай тэндэнцыі — гіперрэалізму. А гэта падыходзіць на ролю яе сімвалу больш, чым бельгійцы браты Дардэн?

Так склалася, і гэта ў цэлым лагічна і натуральна, што калі кіно патрабуецца штуршок для развіцця, яно прыходзіць да рэалізму. Таму што фіксацыя рэчаіснасці ў кадры — гэта яго прырода, і далёкі адыход ад яе становіцца тупіком. Так адрадзілася і гучна пра сябе заявіла італьянскае кіно ў пасляваенны час, атрымала другое дыханне французскае кіно разам са сваёй «новай хваляй» у 50-х.

Пасля гэтага сусветны кінематограф развіваўся па іншых канонах. Да пэўнага, можна сказаць, рэвалюцыйнага моманту, які здарыўся на Канскім кінафестывалі 1999 года. У конкурсе тады былі прадстаўлены Педра Альмадовар, Такешы Кітана, Джым Джармуш, Дэвід Лінч, Атам Эгаян — жывыя класікі кінематографа 80-90-х. Але рашэннем журы Пальмавую галіну атрымаў сацыяльны фільм пра дзяўчынку-тынейджарку, якая спрабуе вырвацца з неспрыяльнага асяроддзя, у якім вырасла. Гэта быў фільм «Разета» братоў Дардэн.

Гэтая і іншыя ўзнагароды кінафестывалю на парозе новага тысячагоддзя каранавалі новы напрамак кіно — новы рэалізм. Гэта і з'яўляецца сённяшнім «радыкальным» кіно, панняцце якога пастаянна мяняецца. У новы кінематограф тысячагоддзя прыйшла дрыготкая камера дакументалістаў, непрафесійныя акцёры, сацыяльныя тэматычныя напрамак і размытыя межы паміж ігравым і неігравым кіно.

Браты Дардэн, у мінулым дакументалісты, сталі пачаткам і сімвалам новага рэалізму. Можна сказаць, іх фільмы жыццёвыя больш за само жыццё. Пасля яны сталі ўлюбёнцамі Канскага кінафестывалю. Амаль кожны фільм рэжысёраў не толькі трапляе ў конкурс, што само па сабе значна, але і атрымлівае ўзнагароды.

Мы глядзелі апошні (пакуль што) фільм братоў Дардэн «Два дні, адна ноч», што быў прадстаўлены ў конкурсе Канскага кінафестывалю ў 2014 годзе. Галоўную ролю ў ім выканала прыгажуня галівудскіх маштабаў Марыён Катыяр. Што важна для кантрастнага ўспрымання безабароннай, слабай гераіні ў рэальным жыцці.

Сачыць за аб'явамі новых паказаў можна на сайце нашай газеты http://zviazda.by/, у сацсетцы «УКантакце» па адрасе https://vk.com/kinodarzv, а таксама на старонцы «Звязды» ў «Фэйсбуку».

Каб трапіць на паказ, трэба ўсяго толькі даслаць сваё імя і прозвішча на электронны адрас kinodar.zv@gmail.com.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
*katsyalovich@zviazda.by*